




# Мы – Захавальнікі ТВП "Балота Званец"!



Міхаіл Краўчук




*Леанід Каўтунчык, Дзяніс Кіцель, Алег Кальчанка*

**Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!**

Калі Вы жывяце каля балота Званец ці маеце магчымасць наведваць яго, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Балота Званец" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Балота Званец", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, заказніка, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

www.iba.ptushki.org

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік "Званец"**

в. Гаравіца, Драгічынскі раён
8 (01644) 7-64-13

Здымкі: М. Верабей, В. Дамброўскі, С. Зуёнак, А. Казулін, В. Лукшыц, А. Мялік, Дз. Якубовіч

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 417

Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org



Вяртлявая чаротаўка

Тэрыторыя, важная для птушак

# БАЛОТА ЗВАНЕЦ

Праект фінансуецца ЕС

IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Балотная сава

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з’яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП “Балота Званец” – буйнейшае ў Еўропе нізіннае балота з агульнай плошчай 16 227 га. Мае міжнародны статус Рамсарскай водна-балотнай тэрыторыі, з’яўляецца рэспубліканскім ландшафтным заказнікам.




**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**

## Цікавыя факты пра ТВП “Балота Званец”

**1** Аснова воднага сілкавання балота – грунтовыя воды. Атмасферныя ападкі складаюць невялікую долю ад усяго аб’ёма.

**2** Тут гняздуюцца паўсюдна рэдкія птушкі – вялікі арлец, дубальт, вялікі кулён, дзяргач, ахова якіх мае асаблівае міжнароднае значэнне.



Дзяргач



Вялікі кулён

**3** На Званцы гняздуецца кожная трэцяя вяртлявая чаротаўка ў свеце! Гэтая птушка вельмі рэдкая, нават знікаючая, бо яна селіцца толькі на нізінных балотах, плошча якіх паступова скарачаецца ва ўсім свеце.



Пагоніч

**4** Вясновыя світанкі на балоце напоўнены шлюбнымі крыкамі шэрых жураваў, пастушкоў і пагонічаў. Увечары можна пачуць ці пабачыць вялікага бугая і балотную саву. Амаль усе гэтыя віды занесены ў Чырвоную Кнігу Беларусі.

**5** Па балоце мазаічна раскіданы сухія астраўкі. Некаторыя з іх маюць плошчу каля 10 га і з’яўляюцца сапраўднымі аазісамі багацейшай і рэдкай флоры сярод аднастайнай расліннасці забалочанай прасторы.



Венерын чаравічак

## Што пагражае ТВП “Балота Званец”?

- Парушэнне гідралагічнага рэжыму балотнага масіву праз меліяратыўныя сістэмы, што вядзе да паводак ці засух, прычым апошнія выклікаюць пажары.



*Для падтрымання гідралагічнага рэжыму балота на каналах былі пабудаваны плаціны*

- Няўстойлівае лесакарыстанне. Высечка лесу на тэрыторыі заказніка праводзіцца без уліку яго значнасці для захавання біяразнастайнасці.
- Выпальванне расліннасці наносіць вялікую шкоду біяразнастайнасці. Разам з травой выгарае верхні пласт тарфяной глебы з карэннямі, гінуць усе насякомыя. Такія выпаленыя балоты не засяляюцца большасцю відаў птушак і іншых жывёл.
- Зарастанне асаковых участкаў хмызнякамі і трыснягом з-за скарачэння сенажацяў і з-за нестабільнасці гідралагічнага рэжыму балота.



*Выпас коней у ваколіцах Званца спрыяе захаванню біяразнастайнасці*